кухни двух народов: рус. *хлеб, каша, пирог, хлеб-соль, щи, блины, калач, квас*; кит. 米 (大米, 米) *рис*; 酒*вино*, 豆腐*соевый творог*; 馒头*паровая пампушка*; 饺子*пельмени*. Данные компоненты в составе ФЕ могут выполнять символическую функцию.

1. Верещагин, Е.М.Национально-культурная семантика русских фразеологизмов / Е.М. Верещагин, В.Г. Костомаров // Словари и лингвострановедение : сб. ст. / под ред. Е.М. Верещагина. – М., 1982. –С. 89–98.
2. Степанов, Ю.С. Константы : слов. рус. культуры : опыт исслед. / Ю.С. Степанов. – М. : Шк. «Яз. рус. культуры», 1997. – 824 с.
3. Телия, В.Н. Русская фразеология: семантический, парадигматический и лингвокультурологический аспекты / В.Н. Телия– М., 1996. – С. 35–37.
4. Телия, В.Н. Культурно-национальные коннотации фразеологизмов// Славянское языкознание/ В.Н. Телия. – М., 1992. – С. 25–36.
5. Цзян Сипин. Безэквивалентная лексика и фразеология в русском и китайском языках: автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.20 / Цзян Сипин; Санкт- Петербурск. гос. ун-т. – Санкт- Петербург, 1995. – 16 с.

НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ СЕМАНТЫКА НАЗВАЎ РЭАЛІЙ ЖЫЦЦЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

С.В. Мартынкевіч
Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

У аснове семантычных сістэм розных моў знаходзіцца паняційны клас, які сфарміраваўся у свядомасці прадстаўнікоў пэўнага этнасу. Лексічныя адзінкі з нацыянальна-культурным кампанентам значэння адлюстроўваюць мысленне і лад жыцця транслююць адметнасці побыту людзей і з'яўляюцца тымі культурнымі універсаліямі, які м іншыя народы не валодаюць. *Актуальнасць* даследавання ў тым, што выяўленне нацыянальна-культурнай семантыкі дазваляе зразумець светапогляд народа, нацыянальны каларыт яго жыцця і асаблівасці менталітэту; пранікненне ў творчую лабараторыю паэта, робіць зразумелай асаблівасць яго творчай манеры.

Мэта артыкула – даследаваць лексічныя адзінкі з нацыянальна-культурным кампанентам значэння ў сучаснай беларускай паэзіі, выявіць адметнасці іх ужывання ў паэтычным радку.

Матэрыялы і метады. Матэрыялам для аналізу паслужылі лексічныя адзінкі з нацыянальна-культурным кампанентам значэння з вершаў Н. Гілевіча. Фактычны матэрыял выбраны са збору твораў Н. Гілевіча. Метады даследавання – аналітычны, параўнальны.

Вынікі і іх абмеркаванне. Нацыянальна-культурныя адметнасці жыцця народа семантызуюцца праз разнастайныя лексічныя адзінкі, якія рэпрэзентуюць багатую краіназнаўчую інфармацыю. Ніл Гілевіч па-майстэрску адлюстроўвае паўсюдзённасць жыцця беларусаў дзякуючы ўжыванню шматлікіх побытавых найменняў. Большая частка слоў – агульнаўжывальныя, але побач з імі функцыянуюць дыялектныя і мясцовыя, якія адрозніваюцца ад літаратурных слоў семантычнымі, граматычнымі ці словаўтваральнымі паказчыкамі.

Прадметы побыту – гэта апазнавальныя знакі ў этнічнай супольнасці народа. З улікам шырокага семантычнага дыяпазону побытавая лексіка ўключае ў сябе дастаткова вялікую сістэму намінацый. Іх значэнне звязана са сферай заняткаў і паводзінамі людзей. Культурна-побытавыя рэаліі ў паэзіі Ніла Гілевіча, можна размеркаваць па наступных тэматычных групах: назвы будынкаў, мэблі, абсталявання, працэсаў і прылад працы, назвы страў і напояў. Разгледзім некаторыя з іх у якасці прыкладу майстэрскага апісання паэтам будзённага жыцця беларусаў.

Дом у беларусаў успрымаецца і як надзейнае месца, дзе чалавек адчувае сябе абароненым, і як памяшканне, жыллё, у якім усе прылады прыстасаваны для яго жыццядзейнасці і гаспадаркі. Сядзіба беларуса была ўладкавана тым, што ён рабіў сваімі рукамі. *"На ўлонні роднага* ***падворка****"* [1, 63] праходзіла жыццё сялянскай сям'і. Матываваная назва *падворак* – двор ля хаты, дзе ёсць *студня* (*"Можа быць, і ў апошні раз / Я глынуў з ацалелае* ***студні*** *вады –...* [1, 30]*"*). Студня адносіцца да рукатворных аб'ектаў – гэта глыбокая яма, умацаваная ад абвалаў зрубам для здабывання вады. Да таго ж лічылася, што вада мае памяць, менавіта з ёй беларусы звязвалі чысціню памкненняў, хуткацечны бег часу. Не абыходзілася беларускае падвор'е без гумна. Назоўнік *гумно* мае праславянскае паходжанне і захаваўся ў беларускай мове з тым жа значэннем – драўлянае збудаванне, прызначанае для абмалоту і прасушвання зерня. Варта адзначыць, што побач са словам *гумно* ўжываліся словы *ток, паветка, пуня, азярод* – збудаванні з жэрдак і слупоў для дасушвання на сонцы снапоў і

Репозиторий ВГУ

скошанай травы, якія з розных прычын не было магчымасці дасушваць на полі ці лузе: *І сапраўды, з* ***гумна*** *да гурту / Паважна крочыў зводны брат* [2, 40].

Трапныя назвы *вышкі* ці *паддашша* мае ў беларускай мове месца паміж страхою і столлю, якое выкарыстоўвалі для гаспадарчых мэт і захоўвалі там на зіму сена для жывёл. Служыла яно і месцам адпачынку селяніну. Напрыклад, як пра гэта гаворыць Ніл Гілевіч*: І ўжо хацеў было падацца / На* ***вышкі*** *ў* ***пуню*** *– самы раз!* [1, 43]; *Паспаў на сене, у* ***паддашшы*** [1, 54].

Назвы прадметаў хатняй гаспадаркі ў паэтычных творах дазваляюць уявіць сабе тагачаснае жыццё, а трапныя параўнанні, прыведзеныя аўтарам, робяць паэтычны радок вобразным, нягледзячы на тое, што гаворка ідзе пра звычайныя рэчы. Хата селяніна не была багатай, аднак мэбля дастаткова шырока прадстаўлена ў беларускай хаце: лаўкі, лавы, сталы, зэдлікі, калыска. І гаспадыня *Садзілася на* ***зэдлік*** *каля печы, / Журботна склаўшы рукі ў прыпале* [1, 62].

Калыска (або люлька) – дзіцячы ложак, які мог быць размешчаны на падлозе ці прымацаваны да столі. Выраблялі калыску з палатна, дрэва, плялі з саломы ці лазы. Выбіралі матэрыялы, расліны або дрэвы, якія хутка растуць – згодна з народнымі ўяўленнямі, гэтак жа хутка, як дрэвы, павінны расці і дзеці. Прытрымліваліся строгага правіла: калыску павінен быў зрабіць нехта з мужчын сям'і – бацька, дзед або родны дзядзька дзіцяці. У калыску клалі абярэгі – крыж, соль; зверху вешалі розныя званочкі і чырвоныя паясы. *Ад сяліб, дзе родныя* ***калыскі*** [1, 96], як гаворыць Ніл Гілевіч, ішлі дзеці ў вялікі свет.

Самая галоўная рэч у хаце – печ.

Я садзіўся каля ***коміна****,*

Ногі спускаў на ***пяколак****,*

Газнічку-смаркачык *ставіў* [1, 37]

Пяколак – цёплае месца на печы; *газнічка* – самаробная газавая лямпа без шкла. Тут жа каля печы – *дзяжа.* Славянскія народы лічылі дзяжу сакральнай рэччу – яна з'яўлялася сімвалам дабрабыту і здароўя.

У ёй рашчынялі цеста для хлеба: *…У* ***дзяжы*** *і на лапаце, / На подзе ў печы* [2, 94]. Да хлеба заўсёды адносіліся з пашанай, бо здабываўся ён цяжкай працай: *З мазаля еў* ***хлеб*** */ З уласнага* [1, 52]. Хлеб з'яўляўся гарантам існавання і сімвалам жыцця. Хлебам пачыналі і заканчвалі кожнае снеданне.

Да этнаграфічных рэалій, якія адлюстроўваюць нацыянальны і гістарычны каларыт, адносяцца назвы страў нацыянальнай кухні. У вершах Ніла Гілевіча пры стварэнні поўнай карціны сялянскага жыцця яны маюць вялікае значэнне. З глыбіні стагоддзяў дайшлі шматлікія самабытныя стравы, сёння ўжо шырока вядомыя за межамі Беларусі: *дранікі, халаднік, заціркa, мачанка* і інш.

Апісанню шчодрасці і гасціннасці адведзена шмат старонак у паэзіі Ніла Гілевіча. Галоўным заўсёды выступае момант апісання застолля. Яно падаецца як святочная цырымонія, заслужаны вынік цяжкай працы беларуса, непасрэдным чынам звязаным з духоўным яднаннем людзей. Завяршэнне працы адзначалі неверагодна смачным абедам або вячэрай. Стравы былі простыя і сытныя, паўсядзённая і святочная ежа не вельмі адрознівалася ў сялянскай сям'і. *Глядзіш – а ўжо* ***кіндзюк*** */ На блюда выклалі з гаршка!* [2, 103]. Кіндзюк – вялікая сыравэнджаная каўбаса, рабілі яе ўзімку, а спажывалі пераважна ў час жніва, калі не было часу гатаваць ежу.

Вяндлінку *з водарам* ***ядлоўца*** */ Мяцеш - зараз па два скрылі!* [2, 104]. Вяндліна – прасолены і правэнджаны ядлоўцам свіны кумпяк. Ягады ядлоўца утрымліваюць разнастайныя смакавыя рэчывы, цэняцца за водар.

А на абрус - нясуць бліны / І к ім – ***мачанку*** [2, 107]. *Мачанка* – малочная або мясная страва беларускай кухні. Назва паходзіць ад слова *мачаць*, бо мачанка ўжываецца не як самастойная страва, а непасрэдна для мачання і падаецца разам з блінамі.

Абрадавай стравай у беларусаў быў кулеш: *Як сёрбаць лыжкаю вялізнай / З катла грамадскага* ***кулеш*** [2, 87]. *Кулеш* – густы, звычайна малочны суп з прасяных або ячных круп.

Заключэнне. У назвах рэалій паўсядзённага жыцця захаваліся адметнасці развіцця беларускага грамадства, адлюстраванне шматвяковых назапашаных ведаў і традыцый. Такія моўныя адзінкі з'яўляюцца сродкам перадачы лінгвакраіназнаўчай інфармацыі, рэпрэзентуюць цесныя ўзаемасувязі культуры і мовы, маюць этнакультурны змест, што дапамагае разгледзіць

Репозиторий ВГУ

аб'ёмны пласт народных уяўленняў. Дадатковыя культуралагічныя значэнні слоў з'яўляюцца нацыянальна-арыентаванымі, паколькі ў кожнага народа свае сімвалы, адзнакі самабытнасці, даўгавечнасці і мудрасці.

1. Гілевіч, Н. Наканаванае : Вершы, паэмы, раман у вершах / Н. Гілевіч. – Мн.: Полымя, 1998. – 462 с.
2. Гілевіч, Н. Родныя дзеці: Раман ў вершах / Н. Гілевіч. – Мн. : Маст. літ., 1985. – 192 с.

ГЕНДЕРНАЯ СОСТАВЛЯЮЩАЯ ВОСТОЧНОБЕЛОРУССКОЙ И ЗАПАДНОРУССКОЙ УРБАНОНИМИИ: СХОДСТВА И РАЗЛИЧИЯ

А.М. Мезенко
Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова

Начиная с 1980-1990-х годов XX в. в лингвистике интенсивно развивается новое направление исследований, получившее название *гендерной лингвистики*, или *лингвистической гендерологии*, основным понятием которой является *гендер*, под которым понимается специфический набор культурных характеристик, определяющих социальное поведение женщин и мужчин, их взаимоотношения между собой, или «социокультурный пол, понимаемый как конвенциональный конструкт, относительно автономный от биологического пола» [1].

К настоящему времени появился ряд работ, в которых делается попытка осмысления и описания онимной лексики, в частности урбанонимной, в связи с феноменом пола, определяются подходы к исследованию проблемы гендера в ономастике [2; 3].

Актуальность данного исследования объясняется тем, что в славянской ономастике вообще и в белорусской в частности «женские» названия улиц в сопоставительном аспекте до сих пор не выступали самостоятельным предметом изучения.

Цель исследования состоит в установлении сходств и различий репрезентации гендерной составляющей восточнобелорусской и западнорусской урбанонимии.

Материал и методы. Материалом для работы послужили данные Государственного кадастрового агентства Республики Беларусь, представляющие собой полные списки названий линейных объектов Витебской, Могилевской, Гомельской областей, и данные по урбанонимии Брянской, Псковской, Смоленской областей Республики Россия, опубликованные в статье А.Н. Соловьева «Мемориальные названия в честь женщин в западнорусской урбанонимии» [3]. Использованы дескриптивный, сопоставительный методы, элементы статистического анализа.

Результаты и их обсуждение. Сопоставление урбанонимиконов четырех приграничных областных центров Беларуси и России (Витебска, Могилева – Смоленска, Пскова), двух средних (Полоцка – Великих Лук) и четырех малых городов (Кричева, Добруша – Дятькова, Почепа), характеризующихся близким количественным составом населения, показало, что в начале XXI в. в среднем соотношение мемориальных названий в честь женщин и в честь мужчин колеблется в восточнобелорусских городах и городских поселках от 1 : 7 (в Полоцке) до 1 : 28 (в Добруше), в западнорусских от 1 : 13 (в Пскове) до 1 : 25 (в Дятькове). Что касается размера населенного пункта, то эта примета оказывается значимой при дифференциации урбанонимиконов областных центров и средних городов, с одной стороны, и малых городов – с другой: в трех из четырех анализируемых малых городов – Кричеве (1 : 21), Добруше (1 : 28), Дятькове (1 : 25) – на один «женский» оним в среднем приходится более 20 «мужских». В четвертом из малых городов – г. Почеп – это соотношение (1 : 14) приближается к тем, что наблюдаются в центрах Псковской (1 : 13) и Смоленской (1 : 16) областей.

Приведенные данные позволяют также заключить, что доля «женских» названий среди всех индивидуальных мемоpативов в малых городах восточной зоны Беларуси более четко противопоставлена их доле в урбанонимиконах областных центров и средних городов.

Проблематику пола из области биологии в сферу социальной жизни, культуры и языка переводят социальные и культурные факторы, в числе которых отношение общества к мужчинам и женщинам, стереотипные представления о мужских и женских качествах. В последние годы не вызывает сомнения мысль о том, что социум, культура и ономастика как часть лексической системы языка пронизаны гендерными отношениями. Не будучи приверженцем феминистской лингвистики, следует констатировать, что как восточнобелорусская, так и западнорусская урбанонимия, заметно пропагандируя мужские ценности и оценки, фиксируют далеко *не женское* видение мира. Кроме

Репозиторий ВГУ